обусловила окончательный провал создать самостоятельное государство на землях племенного союза бодричей.

### Литература


1. *Адам Бременский*. Деяния архиепископов Гамбургской церкви // Адам Бременский, Гельмольд из Босау, Арнольд Любекский СЛАВЯНСКИЕ ХРОНИКИ / Перевод с лат. И. В. Дьяконова, Л. В. Разумовской, редактор-составитель И. А. Настенко. М.: «СПСЛ», «Русская панорама», 2011.
2. *Видукинд Корвейский*. Деяния саксов = ResGestaeSaxonicarum. М.: Наука, 1975. (Памятники средневековой истории народов центральной и восточной Европы).
3. *Гельмольд из Босау*. Славянская хроника // Адам Бременский, Гельмольд из Босау, Арнольд Любекский СЛАВЯНСКИЕ ХРОНИКИ / Перевод с лат. И. В. Дьяконова, Л. В. Разумовской, редактор-составитель И. А. Настенко. М.: «СПСЛ», «Русская панорама», 2011.
4. *Королюк В. Д.* Государство бодричей в правление князя Готшалка. «SlaviaOccidentalis». Poznan, 1962, t. 22. С. 77–108.
5. *Ронин В. К.* Христианизация полабских славян // Принятие христианства народами Центральной и Юго-Восточной Европы и крещение Руси. М., 1988. С. 187–206.
6. *Ронин В. К., Флоря Б. Н.* Государство и общество у полабских и поморских славян // Раннефеодальные народности. М., 1991. С. 116–137.
7. *Саливон А. Н.* К вопросу об образовании народности ободритов // Советское славяноведение. 1979. № 3. С. 42–53.
8. *Саливон А. Н.* Ободриты // Советское славяноведение. 1981. № 4. С.49–61.
9. *Темушев С. Н.* Начало Руси: генезис государственности в источниках и исторической традиции: пособие для студентов ист. фак. Минск, БГУ, 2008.
10. *Титмар Мерзебургский*. Хроника. В 8 книгах/ 2-3 изд., исправл./перевод с лат. И. В. Дьяконова. М.: «Русская панорама», 2009.
11. *Эйнхард.* Жизнь Карла Великого**.** Вступительная статья, перевод, примечания, указатели М.С. Петровой. М.: Институт философии, теологии и истории св. Фомы, 2005.


## ЮРЫДЫЧНАЯ АДКАЗНАСЦЬ ЯК СРОДАК АХОВЫ ПРАВОЎ СУБ'ЕКТАЎ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ АДНОСІН


**Д. В. Сямейка**


Правы грамадзян у інфармацыйнай сферы (права на доступ да інфармацыііі, права персанальных даных і інш.) займаюць асаблівае месца сярод канстытуцыйных правоў грамадзян, таму што яны служаць гарантыяй рэалізацыі іншых правоў і свабодаў чалавека і грамадзяніна. Значэнне правоў у інфармацыйнай сферы, хоць і зусім наіўна, але ўсведамлялася ўжо напачатку фарміравання канстытуцыйнай дзяржавы.

Юрыдычная адказнасць з'яўляецца адным з важнейшых элементаў узаемнай сувязі дзяржавы і інстытутаў цывільнага грамадства. Нормы

права, якія рэгулююць розныя грамадскія адносіны, не могуць быць дзейснымі без юрыдычнай адказнасці. Яе актыўная роля ў жыцці грамадства выяўляецца ў яе функцыях, у якіх становіцца відавочнай яе рэгулюючая, прэвентыўная, аднаўляючая, караючая і выхаваўчая роля. У сучасным разуменні юрыдычнай адказнасці актуальным з'яўляецца прызнанне адказнасці не толькі асобы, але і дзяржавы, яе службовых асоб і органаў.

Нямала навуковых даследаванняў было прысвечана праблемам аховы права на інфармацыю, інфармацыйнай бяспецы, асобным відам юрыдычнай адказнасці ў сферы інфармацыі, але ў іх увага надаецца толькі асобным кропкавым пытанням. Менавіта таму зроблена спроба ў дадзеным артыкуле пазначыць некаторыя аспекты юрыдычнай адказнасці як інстытута прававога рэгуляванння, прааналізаваць сучаснае заканадаўства Рэспублікі Беларусь ў гэтай сферы і паглядзець якія існуюць нормы, рэгулюючыя праваадносіны ў дадзеным кірунку, і, натуральна, паспрабаваць выявіць існуючыя прававыя прабелы і актуальныя праблемы па гэтым пытанні. Мэтай артыкула з'яўляецца навуковае даследаванне інстытута юрыдычнай адказнасці як сродка забеспячэння правоў у інфармацыйнай сферы.

Вывучэнне праблем юрыдычнай адказнасці ўяўляе пэўную складанасць, паколькі ні ў вучэбнай, ні ў навуковай юрыдычнай літаратуры, ні ў заканадаўстве няма паслядоўнай пазіцыі адносна шматлікіх спрэчных пытанняў. Дыскусійнасць, несумяшчальнасць поглядаў на тое альбо іншае пытанне па праблемах юрыдычнай адказнасці патрабуюць іх далейшай распрацоўкі.

Юрыдычная адказнасць – гэта адна з найбольш шырока і актыўна даследуемых тэм у юрыспрудэнцыі. На сучасным этапе развіцця грамадства праблема юрыдычнай адказнасці набыла метадалагічнае значэнне, а ў далейшым, па прагнозах асобных правазнаўцаў, стане светапогляднай [1, с. 11], што, у сваю чаргу, прадвызначае актуальнасць дадзенай праблематыкі і тлумачыць аднаўленне актыўнасці навукоўцаў у даследаванні юрыдычнай адказнасці.

Змена грамадскіх адносін і заканадаўства абумоўлівае пастаяннае абнаўленне зместу прынцыпаў, мэт, функцый і сістэмы юрыдычнай адказнасці. З усяго гэтага можна зрабіць выснову, што разуменне сутнасці і прызначэння юрыдычнай адказнасці мэтазгодна на аснове выкарыстання трыяды мэты – задачы – функцыі юрыдычнай адказнасці.

Паняцце юрыдычнай адказнасці павінна засноўвацца на агульным, родавым паняцці сацыяльнай адказнасці. Сацыяльная адказнасць – гэта дыялектычная ўзаемасувязь паміж асобай і грамадствам, якая характарызуецца ўзаемнымі правамі і абавязкамі па выкананні

сацыяльных нормаў. Юрыдычная адказнасць жа адзіная, але мае дзве формы рэалізацыі – добраахвотную і дзяржаўна-прымусовую.

Юрыдычная адказнасць – гэтая складаная шматпланавая прававая з'ява. Сутнасць юрыдычнай адказнасці не зводзіцца да дзяржаўнага прымусу, а выяўляецца падчас яго ажыццяўлення і ўзнікае пасля ўстанаўлення факта правапарушэння, які з’яўляецца падставай яе ўзнікнення. [2, с. 26]

Задачай юрыдычнай адказнасці з'яўляецца не толькі пакаранне правапарушальнікаў, але таксама ўтрыманне іх ад здзяйснення новых правапарушэнняў і стымуляванне правамерных паводзін людзей. Гэтым юрыдычная адказнасць, нараўне з іншымі сацыяльна-прававымі інстытутамі, закліканая ўносіць свой фундамент у справу фарміравання сацыяльна актыўнай асобы.

Падобная роля юрыдычнай адказнасці ў значнай ступені забяспечваецца прынцыпам яе індывідуалізацыі, які дазваляе выбарча, а такім чынам і больш эфектыўна выкарыстоўваць існуючыя ў распараджэнні дзяржавы сродкі і метады пераканання і прымуса. Інстытут юрыдычнай адказнасці прама звязаны з функцыяй дзяржавы па ахове правапарадку і з'яўляецца паказчыкам рэалізацыі правоў і свабодаў чалавека ў сацыяльнай рэчаіснасці.

Сучасны этап дзяржаўнага развіцця характарызуецца павышанай увагай да феномену інфармацыі з пункта гледжання прававога забеспячэння інфарматызацыі і інфармацыйных працэсаў. У механізме прававога забеспячэння ў інфармацыйнай сферы значнае месца займае барацьба з парушэннямі інфармацыйнага заканадаўства і іх папярэджанне.

У цяперашні час ужо існуе асноўная нарматыўная база па папярэджанні і спыненні правапарушэнняў у інфармацыйнай сферы, але гэта не азначае, што ўсё ўрэгулявана, так як адносіны ў гэтай сферы не стаяць на месцы, а развіваюцца, бадай, хутчэй за якія іншыя.

Юрыдычная адказнасць за правапарушэнні ў інфармацыйнай сферы – гэта ўжыванне да вінаватай асобы, якая здзейсніла правапарушэнне, мер уздзеяння, прадугледжаных санкцыяй парушанай нормы ў вызначаным рэгламентаваным парадку. Падставай для ўзнікнення юрыдычнай адказнасці з'яўляецца здзейсненае суб’ектам інфармацыйных праваадносін правапарушэнне ў інфармацыйнай сферы.

Сёння на заканадаўчым узроўні вызначаныя спосабы прававого рэгулявання адносін у інфармацыйнай сферы. Абарона ажыццяўляецца шляхам, усталявання патрабаванняў і адказнасці за невыкананне іх і іншыя дапушчаныя парушэнні ў гэтай галіне. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь прадугледжвае чатыры віды адказнасці фізічных

асоб за правапарушэнні ў інфармацыйнай сферы – дысцыплінарную (уключаючы матэрыяльную), адміністрацыйную, грамадзянска-прававую і крымінальную. Юрыдычныя асобы прыцягваюцца толькі да адміністрацыйнай і грамадзянска-прававой адказнасці. Аднясенне правапарушэння да тых альбо іншых відаў залежыць у асноўным ад ступені прычыненай грамадству шкоды, асобы правапарушальніка, іншых акалічнасцяў справы, якія ўплываюць на ўзровень адказнасці.

Але іх практычнае прымяненне не такое актыўнае, як патрабуе дадзеная сфера: адсутнічаюць пэўныя механізмы ўжывання і выканання заканадаўства на практыцы, існуюць цяжкасці па накладанні мер уздзеяння за яго парушэнне, адсутнічае сістэматызацыя дзеянняў праваахоўных органаў па ажыццяўленні сваіх абавязкаў і правоў ў інфармацыйнай сферы.

Неглядзячы на даволі якасную распрацаванасць актаў, датычных інфармацыйнай сферы, нормы, рэгулюючыя дадзеная праваадносіны патрабуюць далейшага ўдасканалення. Гэта выклікана развіццём працэсаў інфарматызацыі, што абумоўлівае ўзнікненне якасна новых грамадскіх адносін, патрабуючых удасканалення прававога рэгулявання.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь на заканадаўчым узроўні вызначаны спосабы прававого рэгулявання адносін у інфармацыйнай сферы. Абарона ажыццяўляецца шляхам усталявання патрабаванняў і адказнасці за невыкананне іх і іншыя здзейсненыя правапарушэнні ў гэтай галіне.

Невыкананне ўсталяваных нормаў ў інфармацыйнай сферы можа пацягнуць за сабой дысцыплінарную (уключаючы маёмасную), грамадзянска-прававую, адміністрацыйную альбо крымінальную адказнасць. Аднясенне правапарушэння да таго альбо іншагп віду залежыць у асноўным ад ступені прычыненай грамадству шкоды, асобы правапарушальніка і іншых акалічнасцяў, якія ўплываюць на ўзровень адказнасці.

Але, нажаль, практычнае прымяненне юрыдычнай адказнасці не такое актыўнае, як патрабуе дадзеная сфера: адсутнічаюць пэўныя механізмы ўжывання і выканання заканадаўства на практыцы, існуюць цяжкасці па накладанні мер уздзеяння за яго парушэнне, адсутнічае сістэмнсць у дзеяннях праваахоўных органаў па ажыццяўленні сваіх абавязкаў і правоў ў інфармацыйнай сферы.

Відавочна, што нацыянальнае заканадаўства мае прабел у рэгуляванні адносін, якія складваюцца ў сферы персанальных даных. У Рэспубліцы Беларусь няма адзінага дзеючага нарматыўнага прававога акта, які рэгулюе персанальныя даныя. На аснове гэтага і, ўлічваючы адсутнасць на сённяшні дзень легальнай дэфініцыі паняцця “персанальныя даныя” у

нацыянальным заканадаўстве, адсутнасць эфектыўнага механізму прававой абароны адносін у сферы персанальных даных, бачыцца мэтазгодным развіваць заканадаўства ў гэтым кірунку.

Сучасны этап развіцця грамадства характарызуецца актыўным укараненнем тэхнічных сродкаў кіравання і інфармацыйных тэхналогій ва ўсе сферы яго жыцця. У сувязі з гэтым неабходна вырашыць пытанне аб абароне інфармацыі, назапашваемай у камп'ютэрных сістэмах, сетках, на машынных носьбітах. Магчыма найбольшай увагі патрабуюць да сябе адносіны, якія ўзнікаюць у сетцы Інтэрнэт, бо з кожным днём усё больш і больш людзей сутыкаюцца з неабходнасцю выкарастання Інтэрнэт-рэсурсаў, тым самым павялічваючы колькасць суб'ектаў інфармацыйных адносін. Апошнім часам пачалі рабіцца пэўныя захады па ўрэгуляванні гэтага сегмента, але гэта толькі нязначная частка таго, што патрабуе прававога рэгулявання.

Такім чынам, заканадаўствам прадугледжаны шырокі пералік відаў адказнасці за правапарушэнні і злачынствы ў інфармацыйнай сферы, аднак, відавочна і тое, што сёння патрабуецца ўзмацненне практычнай праваўжывальнай дзейнасці ў дадзенай сферы грамадскіх адносін.

**Літаратура**


1. *Хачатуров Р. Л.* Общая теория юридической ответственности. Москва: Юридический центр Пресс, 2007.
2. *Витрук Н. В.* Общая теория юридической ответственности. Москва: Норма, 2009.


## ПЕШЫЯ ПІЛІГРЫМКІ Ў РОСІЦУ ЯК ФЕНОМЕН РЭЛІГІЙНАГА ТУРЫЗМА БЕЛАРУСІ


## Д. У. ФІЛІПЧЫК


Рэлігійны турызм з'яўляецца неад'емнай і вельмі важнай часткай сусветнага турызма. У цяперашні час у свеце больш за 200 млн. чалавек у год удзельнічаюць ў паломніцтвах і рэлігійных вандраваннях, прычым больш за 70 % з іх гэта хрысціяне [1, с. 385]. Па прагнозе Сусветнай турыстычнай арганізацыі, да 2020 г. рэлігійны турызм увойдзе ў чацвёрку самых папулярных відаў турызма ў свеце [2].

У дзяржаўнай праграме развіцця турызма ў Рэспубліцы Беларусь на 2011–2015 гг. сярод накірункаў развіцця турызма адзначаны і рэлігійны турызм [3]. Праведзеныя сацыялагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што значная частка рэспандэнтаў, асабліва сярод моладзі, гатова ўдзельнічаць у рэлігійным турызме [4, с. 241]. Рэлігійны турызм выклікае цікавасць не толькі з боку вернікаў, але і з боку іншых слаёў насельніцтва, што надае гэтаму віду турыстычнай дзейнасці асаблівае значэнне для развіцця ўнутранага турызма ў Беларусі [5, с. 72]. Паколькі